КРАЕВЕДЧЕСКИЙ
СОЛИГОРСКА

# РАЗМАХ РАБОТ

У 1964 годзе перад будаўнікамі другога калійнага камбіната стаяць вялікія задачы. Многае ім патрэбна зрабіць. Нягледзячы на зімовы перыяд, на ўсіх будаўнічых аб'ектах работы вядуцца шырокім фронтам у дзве і тры змены.

Будаўнічае ўпраўленне № 105 заканчвае ўзвядзенне фундаментаў пад стальны каркас галоўнага корпуса абагачальнай фабрыкі і ў бліжэйшы час трэст «Саюзсталькаструкцыя» прыступіць да мантажу каркаса. Вядуцца мантажныя работы па ўзбуйненай зборцы капра ствала № 3 у гарызантальным становішчы. Затым капёр будзе пастаўлен на «ногі». Манціруецца шахтная пад'ёмная машына ствалоў № 1 і № 3.

Шахтапраходчыкі днём і ноччу вядуць работы па збойцы ствалоў № 1 і № 3. Графік работ яны значна апярэджваюць.

Вялікія задачы пастаўлены перад калектывам горнакапітальнага ўчастка. Так, на падрыхтоўку рудніка да прамысловай здабычы солі, тэрмін вызначан амаль у тры разы меншы, чым на першым камбінаце. Акрамя гэтага, неабходна прайсці 22 кіламетры горных выпрацовак, што ў два разы перавышае аб'ёмы горнакапітальных работ, якія выкананы на першым камбінаце. Гэта будзе дасягнута шляхам прымянення новых камбайнаў, якія вызначаюцца высокай выпрацоўкай.

Размах і ход будаўнічых работ гаворыць за тое, што другі калійны камбінат будзе ўведзен у дзеянне намнога раней намечанага тэрміну і пачне служыць сельскай гаспадарцы.

К. МЕНЖЫНСКІ,
галоўны інжынер другога калійнага камбіната.